перавязкі накшталт вузкіх ручнічкоў, вянкі. Замужнія кабеты на людзях мусілі пакрываць галаву і звычайна насілі намітку – галаўны ўбор ручніковага тыпу Намітка «мноствам спосабаў павівалася вакол галавы на спецыяльным каркасе, канцы яе прыгожа драпіраваліся на спіне, а постаць жанчыны атрымлівала выключную статнасць і велічнасць» [2, с. 3].

У пэўнай мясцовасці Беларусі традыцыйны жаночы касцюм, як і мужчынскі, меў свае асаблівасці.

У адпаведнасці з гістарычнымі, геаграфічнымі, этнакультурнымі і лінгвістычнымі крытэрыямі даследчыкі вылучаюць на тэрыторыі Беларусі шэсць лакальных разнавіднасцей беларускага народнага адзення: Наддзвінне, Панямонне, Цэнтральная Беларусь, Прыдняпроўе, Заходняе Палессе, Усходняе Палессе [2, с. 3]. Так, на Гродзеншчыне, г.зн. Панямонні, спадніца і фартух былі пераважна зялёнага і валошкавага колераў.

Такім чынам, беларускі традыцыйны жаночы касцюм валодае яркай нацыянальнай спецыфікай, якая праяўляецца ў пэўным наборы прадметаў гарнітура жаночага адзення, спалучэнні колераў, выкарыстаным арнаменце. Беларускі традыцыйны жаночы касцюм не толькі выконваў сваю асноўную функцыю (служыў адзеннем), але і быў сродкам адрознення сваіх ад чужых, паказчыкам узросту і сямейнага статусу жанчыны, абаронай ад злых духаў. У розных мясцовасцях Беларусі традыцыйны жаночы касцюм меў свае адметнасці.

Літаратура:

1. Химдиат, Н. А. Преемственность традиций народного искусства в проектировании современной женской одежды : дис. ... магистр. тех. наук : 50.01.02 / Н. А. Химдиат ; ВГТУ. – М., 2019. – 188 с.
2. Раманюк, М. Ф. Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981.

Репозиторий ГрГМУ

# МАНУМЕНТ У ГОНАР САВЕЦКАЙ МАЦІ-ПАТРЫЁТКІ КУПРЫЯНАВАЙ У ЖОДЗІНА

**Барадзіч Х. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.

Мэтай дадзенай працы з’яўляецца захаванне памяці аб загінуўшых земляках у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Манумент маці-патрыёткі Купрыянавай – гэта з самых значных і велічных помнікаў у горадзе Жодзіна [1; 2]. Помнік быў адкрыты 29 жніўня 1975 года.

Манумент уяўляе сабой выцягнутую па гарызанталі скульптурную кампазіцыю, зробленую з бронзы і граніту. На ім можна ўбачыць 6 фігур: Анастасія Фамінічна Купрыянава і 5 яе сыноў. Вышыня манумента складае 4 метры.

Аўтарамі манумента ў гонар савецкай маці-патрыёткі Купрыянавай з'яўляюцца архітэктар А. Г. Трафімчук, скульптары А. М. Заспіцкі, І. Я. Міско і Н. А. Рыжанкоў. У 1977 калектыў аўтараў манумента быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй СССР.

У гэтым помніку ўвасоблены драматычны лёс маці-патрыёткі Анастасіі Фамінічны Купрыянавай, жыхаркі горадаЖодзіна, якая праводзіць 5 сваіх сыноў на страшную і суровую Вялікую Айчынную вайну з надзеяй іх вяртання.

На пярэднім плане манумента размешчаны старэйшыя сыны: Сцяпан, Мікалай, Міхаіл. Яны ўвасабляюць у сабе агульныя вобразы савецкіх воінаў: цвёрдая хада, баявы настрой, моцна сціснутыя ў руках вінтоўкі.

За імі ідзе чацвёрты сын, Уладзімір, і пяты, самы малодшы, – Пётр, вобраз якога выяўлены ў лірычным плане. Ён спыніўся, каб кінуць развітальны погляд на маці, якая застыла ў хвалюючым маўчанні – хто ведае, ці ўдасца сустрэцца зноў!

Ззаду размешчана прамая і суровая фігура маці ў простай вясковай вопратцы, з напружанымі рукамі, якая выпраўляе сваіх сыноў сумным позіркам. Яна ўпотай сцірае слязу: "Ідзіце, сыночкі, біце ворага і вяртайцеся з перамогай!» У ёй сінтэзуюцца пачуцці ўсіх маці, якія благаславілі сыноў на подзвіг у імя сваёй Радзімы.

На жаль, усе 5 сыноў загінулі на вайне і аддалі жыццё за вызваленне сваёй Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Міхаіл памёр ад ран у Барысаўскай турме, Сцяпан забіты 29 ліпеня 1944 года ў Беластоцкай вобласці Польшчы, Мікалай прапаў без вестак у снежні 1944 года на тэрыторыі Польшчы, Уладзімір таксама прапаў без вестак, Пётр па-геройску загінуў 2 лістапада 1944 года пры вызваленні Латвіі. Яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 23 сакавіка 1945 года ў Жодзіна ў гонар Пятра быў устаноўлены помнік.

Сама Анастасія Фамінічна Купрыянава нарадзілася 20 красавіка 1872 года ў вёсцы Міхеды, Лагойскага раёна. У гады савецкай улады працавала ў калгасе. Пасля вайны Купрыянава шмат увагі надала патрыятычнаму выхаванню моладзі. У 1972 годзе А. Ф. Купрыянавай прысвоена званне ганаровага жыхара горада Жодзіна. Памерла яна 13 красавіка 1979 года ў доме, у якім пражывала. У 1980 годзе быў адкрыты музей у гонар маці-патрыёткі Купрыянавай.

Такім чынам, манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі Купрыянавай у Жодзіна адлюстроўвае ўсю трагічнасць савецкага народа, асабліва маці, у якіх вайна забрала блізкіх ім людзей. Ён з'яўляецца сімвалам подзвігу савецкіх жанчын-маці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Помнік нагадвае нам, што мы павінны памятаць пра гэтыя подзвігі і не забываць пра тое, якімі ахвярамі нам дастаўся мір.

Репозиторий ГрГМУ

Літаратура:

1. Монумент в честь советской матери-патриотки Куприяновой в Жодино [Электронный ресурс]. – Режим доступа: //https://a-taurus.by/monument-patriotki-kuprijanovoj/. – Дата доступа: 05.10.2024.

2. Монумент в честь матери-патриотки в Жодино [Электронный ресурс].– Режим доступа: //https://planetabelarus.by/sights/monument-v-chest-materi-patriotki-v-zhodino/. – Дата доступа: 05.10.2024.

# ПАЛАЦ РУМЯНЦАВЫХ І ПАСКЕВІЧАЎ – АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ

**Бруханава В. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.

Вызначыць асаблівасці архітэктурнага стылю палаца, яго гістарычную і культурную каштоўнасць для Беларусі – мэта дадзенай працы.

Гомель – адзін з абласных цэнтраў Беларусі, які мае багатую гісторыю і мноства культурных славутасцяў. Размешчаны на паўднёвым усходзе краіны, гэты горад славіцца сваёй утульнасцю і прыгожымі прыроднымі краявідамі. Палац Румянцавых і Паскевічаў – гэта адзін з самых цудоўных будынкаў у гістарычным цэнтры Гомеля, які з'яўляецца яркім узорам архітэктурнай спадчыны Беларусі. Палацава-паркавы ансамбль быў узведзены ў XVIII стагоддзі і з тых часоў прыцягвае ўвагу турыстаў і даследчыкаў гісторыі [1].

Гісторыя палаца пачалася з узвядзення будынка ў стылі барока для князя Мікалая Румянцава, які быў вядомым расійскім палкаводцам і дыпламатам. Пазней палац перайшоў ва ўласнасць князя Паскевіча, які ўнёс свае змены ў архітэктуру будынка, надаўшы яму некаторыя рысы класіцызму. Асаблівасцю палаца Румянцавых і Паскевічаў з'яўляецца яго ўнікальны архітэктурны стыль, які спалучае ў сабе элементы барока і класіцызму. Фасады будынка ўпрыгожаны вытанчанымі калонамі, разьбой і фрэскамі, ствараючы велічнае ўражанне. Унутранае ўбранне палаца захапляе раскошай і вытанчанасцю дэкору: тут можна ўбачыць карціны знакамітых мастакоў, разьбяныя сталі, мармуровыя каміны і мэблю з каштоўных парод дрэва. Навакольны паркавы комплекс таксама з'яўляецца неад'емнай часткай яго прыгажосці. Тут можна ўбачыць старажытныя дрэвы, рэдкія расліны, фантаны і скульптуры, якія ствараюць прыемную атмасферу і запрашаюць гасцей на прагулкі і адпачынак.

Палац Румянцавых і Паскевічаў не толькі ўяўляе гістарычную каштоўнасць, але і з'яўляецца сімвалам багацця і раскошы эпохі

Репозиторий ГрГМУ